# Навуковае суправаджэнне

**І Рэспубліканскі форум маладых вучоных устаноў вышэйшай адукацыі прайшоў на платформе Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава.**



На працягу двух дзён будучыя прафесары і акадэмікі з ліку сённяшніх студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, прафесарска-выкладчыцкага складу расказвалі пра вынікі навукова-даследчай дзейнасці, абменьваліся ідэямі і вопытам, каардынавалі сумесныя планы, наведвалі прадпрыемствы свабоднай эканамічнай зоны "Віцебск". "З'яднаць маладыя сілы рэспублікі, каб выпрацаваць агульныя ідэі развіцця," — акрэсліў нацэленасць форуму міністр адукацыі Андрэй Іванец. Больш за 10 тысяч маладых вучоных — магутны інтэлектуальны пласт, здольны рухаць наперад не толькі навуку, але і ў цэлым краіну. Найбліжэйшая перспектыўная мэта — стварыць платформу для рэалізацыі міжуніверсітэцкіх навуковых, навукова-тэхнічных, інавацыйных праектаў маладых вучоных.



— Навукова-даследчая дзейнасць заўсёды павінна мець комплексны характар і арыентавацца як на атрыманне новых навуковых вынікаў, так і на адкрыццё новых імёнаў, — адзначыў кіраўнік ведамства. — Развіццё краіны ў цэлым звязана з інавацыйным развіццём, а для гэтага, безумоўна, патрабуюцца кадры. Ад таго, хто прыйдзе сёння ў аўдыторыю да студэнтаў, залежыць тое, хто з яе выйдзе.

**Рэктар ВДУ імя П.М.Машэрава, доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна Багатырова:**
***"Для маладых вучоных у нашым універсітэце створаны выдатныя ўмовы, вынікі адпаведныя. Сведчанне таго — 37 дыпломаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у Беларусі".***

Нарошчванне патэнцыялу айчыннай навукі, эфектыўнае выкарыстанне вынікаў даследаванняў і паскоранае ўкараненне іх у практыку — найважнейшыя прыярытэты дзяржаўнай палітыкі. Асабліва значна ўключэнне ў гэтую работу таленавітых маладых людзей, каму наканавана вызначаць не толькі сучаснасць, але і будучыню навукі і грамадства.

Разам з моладдзю ўдзельнікамі форуму сталі прадстаўнікі НАН Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі і Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. На інтэрактыўнай выставе ў холе ўніверсітэта свае дасягненні прадставілі маладыя вучоныя Віцебшчыны. Праграма прадугледжвала дыялогавыя пляцоўкі, панэльную сесію з навукова-практычнымі трэнінгамі, пленарныя пасяджэнні, работу па секцыях і "залатыя лекцыі" па сучасных навуковых напрамках.

У Віцебскім філіяле Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі адбыўся выязны семінар-нарада па прасоўванні праекта "Разумныя гарады Беларусі" — першая з запланаваных Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі сумесна з Міністэрствам адукацыі рэгіянальных сустрэч па названай тэматыцы. На сёння распрацаваны навуковае суправаджэнне і мадэль праекта. Сфарміраваная тэарэтычная база абапіраецца на высокі ўзровень развіцця айчыннай IT-інфраструктуры і тэхналогій. На парадку дня — вызначэнне дакладнага алгарытму ажыццяўлення праекта. Будова платформы разнапланавая. Так, дадатак "Мой горад" дазваляе хутка знайсці патрэбную жыхарам і гасцям населенага пункта інфармацыю — у прыватнасці, аб паслугах мясцовых прадпрыемстваў. Прыкладам можа паслужыць эксперыментальнае ўкараненне дадатку "Мабільны паштальён" у Оршы. Да зацікаўленай размовы разам з кіраўнікамі абодвух міністэрстваў-партнёраў, структурных падраздзяленняў арганізацый галіны сувязі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі і суправаджэнні праекта, далучыліся прадстаўнікі кіраўніцтва аблвыканкама і райвыканкамаў, устаноў адукацыі Віцебшчыны, а таксама бізнесу і грамадскіх арганізацый. Укараненне любых тэхналогій немагчыма без кваліфікаваных кадраў. Як праінфармаваў міністр адукацыі, у Беларусі спецыялістаў для IT-сферы рыхтуюць у 19 установах вышэйшай адукацыі і 34 установах ССА больш як па 60 спецыяльнасцях. Пастаянна пашыраецца іх колькасць, абнаўляюцца стандарты і праграмы. Для далейшай эфектыўнай работы трэба сфарміраваць пералік актуальных для лічбавай эканомікі прафесій, вызначыць патрэбнасць галін у спецыялістах, распрацаваць кваліфікацыйныя патрабаванні. Зыходзячы з гэтага, новыя спецыяльнасці будуць унесены ў Дзяржаўны класіфікатар.

***У гэтыя ж дні ў горадзе над Дзвіной творчую моладзь аб'яднаў заключны этап "АРТ-вакацый", у ходзе якога былі названы ўладальнікі гран-пры рэспубліканскага фестывалю. У мерапрыемствах прыняў удзел міністр адукацыі Андрэй Іванец.***

**Таццяна БОНДАРАВА.**
**Фота аўтара.**